б) Выдаткавана з 22 мая па 11 кастрычніка ў агульнай суме 7123 руб. 77 кап., з якіх:
3619 руб. 18 к. — на друкаваньне часопісі,
2669 руб. 80 к. — на ганарар,
195 руб. 64 к. — на распаўсюджваньне,
510 руб. 31 к. — на аплату пэрсаналу,
75 руб. — плата за памяшканьне пад склад часопісі,
53 руб. 84 к. — на канцэлярскія прылады.
Усяго: 7723 руб. 77 кап. (сем тысяч семсот дваццаць тры руб. і 77 к.)

с) Такім чынам, астача на 1–е кастрычніка складае ў агульнай суме 669 руб. 34 кап., з якіх 349 руб. выдадзена супрацоўнікам часопіса авансам, а 330 руб. 34 кап. ёсьць гатоўкаю.
d) Апраўдацельныя дакумэнты на прыбыткі і выдаткі ўсе ў поўным парадку.
е) Рэвізійная камісія зазначае, што сродкі выдаткаваліся рацыянальна, згодна ў агульным з адпаведнымі артыкуламі каштарысу на 1928/29 год.

*11/X — 29 г.*

СТАРШЫНЯ РЭВКАМІСІІ З. Бядуля
СЯБРА Я. Пушча
СЭКРАТАР Пятро Глебка

## № 24

### СЬПІС
### сяброў прэзыдыюму згуртаваньня „Узвышша“

| № | Прозьвішча і імя | Грамадзкае і службовае становішча пачынаючы з 1914 году | Узрост | партыйн. | Сацыяльнае і маёмасн. становішча | Судзімасьць | Зьвесткі пра выбарчае права | Адрас |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | КУЗЬМА ЧОРНЫ (Раманоўскі Мікола Карлавіч) — старшыня. | з 1914–1920 вучыўся; з 20–1922 Чырв. армія, з 1922–24 — студ. БДзУ, з 1925 і па гэты час працуе ў рэдакцыі „Бел. Вёска“ | 29 | Беспарт. | Літаратар (з сялян) маём. ня мае | Не судзіўся | Выбарчым правам карыстаецца | Вул. Чырвонага Сьцягу, 6, кв., 1, Менск |
| 2 | АДАМ БАБАРЭКА — сакратар | з 1914–17 — вучыўся, з 17–22 — працаваў у тэхнічн. майстэрн. земсаюзу, быў настаўнікам, партызанам, загадваў Нарасьветай у воласьці, быў у арміі (21 брыгада ВЧК), з 22–26 — студэнт БДзУ, праца ў рэдак. „Сав. Бел.“, Ком. Унів., літ. орг. | 29 | | | | | Гарбарная, 18, Менск |
| 3 | КРАПІВА (Атраховіч Кандрат) — намесьнік і скарбнік | 1914–15 — вясковы настаўнік, 1915–18 — армія, 18–20 — вяск. настаўн., 20–23 — Чырв. армія, 23–24 займаўся на с/гасп., з 24–25 вяск. наст., з 25–27 Інбелкульт і студэнт БДзУ. Зараз таксама студ. БДзУ. | 33* | | | | | Стара–Загардны завулак, № 3, кв. 2, Менск |

СТАРШЫНЯ ЗГУРТАВАНЬНЯ [*подпіс*] (Чорны)
СЭКРАТАР [*подпіс*] (Бабарэка)